# Творчасць без канца

**Часцей за ўсё незвычайнае захоўваецца ў простым. Але, каб убачыць таямніцы існасці, недастаткова пільнага вока. Трэба яшчэ асаблівы стан душы...**



Аляксандр Каркоў, загадчык аддзела мастацка-прыкладной творчасці ЦТДІМ, у сваіх захапленнях чалавек вельмі разнабаковы. Аднак гэта не азначае, што ён мітусіцца паміж работай і хоббі.

- Адкуль узялася такая цікавасць да напісання карцін, нацюрмортаў? - пытаюся ў яго.

- Наогул кажучы, я пачаў маляваць яшчэ ў дзіцячым садку, - адказвае. – Гэта былі персанажы з мультфільмаў. Тата, які добра сам малюе, мне дапамагаў іншы раз. Вучыў усё рабіць правільна.

Сваё захапленне працягваў развіваць у школе. Вельмі любіў урокі выяўленчага мастацтва, якія вёў Мікалай Саўчанка. Калі настаўнік расказваў аб карцінах, увесь клас слухаў з заміраннем сэрца, настолькі гэта было цікава. Менавіта Мікалай Паўлавіч паўплываў на Аляксандра ў выбары прафесіі. Ён заўважыў у юнака талент. Пасля школы Аляксандр вучыўся ў Магілёўскім універсітэце імя А. А. Куляшова. Спецыяльнасць па дыплому – “Пачатковая адукацыя і выяўленчае мастацтва”.

А працаваць стаў на малой радзіме ў Хоцімскім ЦТДІМ. З тае пары мінула ўжо дзесяць гадоў. Цяпер гэта ўжо майстар сваёй справы. У творчай скарбонцы Аляксандр мае шмат работ. Як ён сказаў, яму бліжэй графіка, якая выконваецца алоўкам.

На маё пытанне, што больш любіць пісаць, адказаў - пейзажы. Свае работы, выкананыя акварэллю і алоўкам, прадстаўляў на раённыя выстаўкі. І цяпер яго творчая рапсодыя працягваецца. Доўгімі зімовымі вечарамі з-пад рук майстра з’яўляюцца на свет новыя творы.

У апошні час Аляксандр займаецца яшчэ і выцінанкай. Гэта традыцыйнае беларускае народнае мастацтва - вырэзванне з паперы. Кампазіцыю малюнкаў ён прыдумвае сам. Атрымліваецца вельмі прыгожа.

А яшчэ Аляксандр Каржоў захапіўся фатаграфіяй. На цыфравую камеру ў асноўным здымае прыроду, вышукваючы прыгожыя куточкі на нашай Хоцімшчыне.

У красавіку Аляксандр быў удзельнікам абласной фотавыстаўкі ў Магілёве пад назвай "Вада. У пошуках загадкавага". Свае работы прадставілі майстры фота з усіх раёнаў вобласці. У намінацыі "Вычварнасці неба" Аляксандр Каржоў заняў першае месца. Яму ўручаны Дыпплом I ступені Дзяржаўнай установай дадатковай адукацыі "Абласны цэнтр творчасці". А ў намінацыі "Стыхія вады" ён стаў другім. Атрымаў Дыплом II ступені.

- Гурток "Выяўленчае мастацтва" наведвае больш 10 хлопчыкаў і дзяўчынак рознага ўзросту, - расказвае дырэктар ЦТДіМ Валянціна Сідарэнка. – Да Аляксандра яны ходзяць з вялікім задавальненнем. Вядзе гурток у абодвух дзіцячых садзіках. А ўвогуле ён вельмі творчы, ініцыятыўны чалавёк. Пастаянна ў пошуках новага, цікавага. Не лічыцца са сваім асабістым часам. Ва ўдасканаленні валодае кам'ютэрам. Іншы раз дапазна за ім сядзіць. А на другі дзень прыпадносіць нам сюрпрыз: абавязкова што-небудзь зробіць новае па афармленню стэндаў, буклетаў, рэкламы, афішы і інш. Тут ён прымяняе камп'ютэрную графіку. Атрымліваецца прыгожа. Нам вельмі пашанцавала, што працуе ён у нас.

**Наталля КАЦЯШОВА.**
**На здымку: Аляксандр Каржоў.**

**Кацяшова, Н.** Творчасць без канца : аб захапленні Аляксандра Каржова / Наталля Кацяшова // Шлях Кастрычніка. — 2012. — 23 чэрвеня. — С. 4.